УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
Факультэт фізічнага выхавання
Кафедра спартыўных дысцыплін
Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт
Упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму
Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт
Аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму

# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ Ў ГОРАДЗЕ І НА СЯЛЕ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ




Репозиторий БрГУ имени А.С. Пушкина

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
Факультэт фізічнага выхавання
Кафедра спартыўных дысцыплінаў
Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт
Упраўленне па фізічнай культуры, спорту і турызму
Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт
Аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму

Репозиторий БрГУ имени А.С.Пушкина

# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ

## Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ Ў ГОРАДЗЕ І НА СЯЛЕ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ

Зборнік навуковых прац

Брэст
«Альтернатива»
2013

УДК 796.011.5

**ЛЮКЕВІЧ Ул.П.**
Беларусь, Брэст, УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

# МАРАЛЬНЫЯ ВЫМЯРЭННІ СУЧАСНАГА СПОРТУ: УПЛЫЎ НА ФАРМАВАННЕ КУЛЬТУРЫ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ

## УВОДЗІНЫ

Сучасны спорт у сістэме сацыяльных адносінаў глабалізаванага грамадства на этапе дамінавання ягонага інфармацыйнага складальніка працягвае заставацца даволі спецыфічнай сферай чалавечай жыццёвай дзейнасці. Становішча такога кшталту вызначаецца шэрагам асаблівасцяў, якія маюць дачыненне да эканамічных, палітычных, культурных, нацыянальных, дэмаграфічных і іншых паказальнікаў развіцця той ці іншай дзяржавы. Няпісаны і неаспрэчаны закон, што характарызуе якасную ўзаемазалежнасць паміж узроўнем сацыяльнага дэвэлэптынгу і ўзроўнем развіцця спорту, грунтуецца на такой катэгарычнай выснове, як: больш высокі ўзровень развіцця спорту адпавядае краінам з больш высокім узроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прычым, пад увагу бяруцца не толькі і не столькі спартыўныя вынікі і дасягненні, а перад усім агульнае становішча спартыўнай інфраструктуры. Спорт з шэрагу повадаў аказвае наймацнейшае ўздзеянне на фармаванне асабістай культуры дзяцей і моладзі, а сродкі масавай інфармацыі яшчэ больш павялічваюць і пашыраюць ягоны ўплыў.

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

Спорт з'яўляецца неад'емнай часткай функцыянавання чалавечага грамадства. Праўда, тое месца, якое ён займае, вызначаецца мноствам самых разнастайных супярэчнасцяў. З аднаго боку, яны выглядаюць як дыялектычныя супрацьлеглыя катэгорыі, лёгка падводзяцца пад суадносіны «дабро і зло», «справядлівасць і несправядлівасць», «індывідуалізм і калектывізм». З другога боку, спорт паўстае як нейкая сацыяльная выключнасць, калі бяруцца пад увагу адпаведныя эканамічныя, прававыя і маральныя аспекты. Як піша Юзэф Ліпец, «спорт прагне быць выключанай энклавай жыцця, але хоча і вымушаны ўсё роўна да яго вяртацца [5, 172]. Па вялікім рахунку сучасная спартыўная рэчаіснасць балансуе адразу паміж некалькімі рэальнасцямі. Перш за ўсё, гэта звычайная побытавая рэальнасць. Няхай на ўзроўні культуры інфармацыйнага грамадства найлепшыя і самыя знакамітыя чэмпіёны на пэўны час ператвараюцца ў герояў сённяшняга дня, у ідалаў для падлеткаў і моладзі. Няхай адбываецца так званае капіяванне паводзінаў гэтых спартоўцаў праз нялічаныя колы заўзятараў. Няхай фармуецца іншая сістэма спецыфічных сацыяльных сувязяў. Але пераважна на самой справе цяперашнія чэмпіёны – самыя звычайныя людзі, якія, па большасці, не маюць нават адпаведнай высокай ступені адукаванасці.

Сучасны спорт на цяперашнім этапе свайго развіцця знаходзіцца ў даволі складаным для рацыянальнага асэнсавання становішчы. Праблема па вялікім рахунку палягае, з аднаго боку, на суадносінах мэты і сродкаў спартыўнай дзейнасці, а з другога, – паступовага ператварэння феномену спорта з сістэмы канкурэнцыйных здольнасцяў чалавечай асобы ў банальны бізнэс, які ўпакаваны ў прыгожы каляровы фанцік.

Як заўважаюць М. Чахоўскі і А. Дамброўска, сітуацыя ў прафесійным спорце – а менавіта ён прыцягвае ўвагу мільёнаў людзей, якія ператвараюцца ўжо нават не ў заўзятараў, а ў звычайных спажыўцоў, што проста купляюць адпаведны тавар, – выглядае даволі дзіўна. Напрыклад, выяўляецца ўсё больш выпадкаў астмы ў спартоўцаў

Репозиторий БрГУ им. А.С. Пушкина

ў тых дысцыплінах, дзе патрабуецца вынослівасць, і таму ім афіцыйна дазваляецца прымаць адпаведныя лекі. Усё больш небяспечнымі становяцца саначныя трасы, таму што вялікая хуткасць добра ўспрымаецца і яшчэ лепш «прадаецца» гледачам. Новыя тэхнічныя вынаходніцтвы даюць перавагу скакунам з трампліну, плыўцам, лёгкаатлетам. І таму, калі ў гэтай не вельмі прыязнай атмасферы канкурэнцыйнасці ўсё роўна здараюцца выпадкі, што класіфікуюцца не інакш, як патрэба таго, што чалавек мае быць добрым, то яны адразу становяцца прадметам масавага абмеркавання. Часам атрымліваецца, што такія ўчынкі асобы ўзнагароджваюцца, і гэтыя атлеты, адпаведна, становяцца ўзорамі для дзяцей і моладзі. Непрадказальнасць развіцця сацыяльных падзеяў, адсутнасць аптымізму ў дачыненні да «наступнага дня» увогуле практычна на вачах змяняе стэрэатыпы ў паводзінах моладзі. Але разам з тым маладыя людзі ў сваім школьным і сяброўскім жыцці, а таксама ў спорце выказваюць патрэбу ў сумленных адносінах. Праўда, цяжка парой ацаніць, наколькі гэтыя дэкларацыі могуць быць верагоднымі. Успрыманне і рэалізацыя прынцыпаў Fair play у спорце ў моладзі абцяжарваецца нарастаннем адлегласці паміж ідэалам і рэчаіснасцю. Вельмі часта паўстаюць сітуацыі, дзе не маецца шанцаў на этычны выбар, таму што навакольнае атачэнне пазбаўленае адпаведных узораў такога выбару: лічацца толькі перамогі, прыбыткі, узнагароды [2, 22-23].

Імідж сучаснага спартоўца, які пераважна сфармаваны сродкамі масавай мнфармацыі і растыражаваны імі па ўсім свеце, не можа не адбіцца на светаўспрыманні шмат якіх юнакоў і дзяўчат. Выгляд паспяховага, здаровага, прыгожага і багатага атлета на глянцавай вокладцы каляровага часопіса ці на экране манітора дазваляе меркаваць пра атракцыйнасць спартыўнай дзейнасці. А калі да гэтага яшчэ дадаць пачуццёва кранальную гісторыю пра беднага хлопчыка-імігранта, бацькі якога знаходзіліся ў сепарацыі, які змог вытрымаць усе выпрабаванні, каб, нарэшце, стаць «зоркай» спорту, то падобны PR-ход загадзя вызначаецца ў якасці стопрацэнтова ўдалага [3]. Дарэчы, калі б топ-мэнэджэры FC Barcelona па нейкіх прычынах не змаглі б рэалізаваць свой праект «Леанэль Месcі», то адразу быў бы запушчаны запасны блізкі па зместу варыянт з падобнай гісторыяй, якая выклікае замілаванне, слёзы і пачашчанае біццё сэрца.

Але спорт, безумоўна, мае другі бок, які выглядае не так прывабна. Ён таксама мае ўсе падставы быць масава абмеркаваны і прааналізаваны. Жорсткая барацьба за першынство, якая скасавала фундаментальныя алімпійскія прынцыпы, – хочацца спадзявацца і верыць, што толькі часова, – вызначылася галоўным і на сёння амаль адзіным дэвізам – «Перамога за ўсялякі кошт». Менавіта гэтае ўсведамленне прымушае звярнуцца да сферы маральнасці, што часам дае нечаканыя вынікі «пакутаў сумлення». Праўда, не заўсёды яны адэкватна адлюстроўваюць рэчаіснасць.

Адной з найбольшых праблемаў у сучасным спорце з'яўляецца становішча з ужываннем допінгу. Да таго часу пакуль не пачало працаваць на ўсю моц Сусветнае Анты-допінгавае агенцтва (WADA) атлеты адчувалі сябе параўнальна бяспечна. Але калі супрацоўнікі WADA пачалі прымяняць найноўшыя тэхналогіі і вынаходніцтвы, калі на працягу года сталі праводзіцца праверкі спартоўцаў нават па-за сістэмай спаборніцтваў, калі пробы на допінг сталі захоўвацца на даўгатэрміновы час, выпадкі выкрыцця допінгу нашмат пачасціліся. Так, напрыклад, Ланс Армстранг, бадай, самы вядомы веларгоншчык сучаснасці, які сем разоў запар у 1999-2005 гг. перамагаў у агульным заліку ў Tour de France, урэшце быў злоўлены на ўжыванні допінгу. Для грамадскай думкі гэта быў шок, таму што спартовец вызначыўся яшчэ і тым, што

Рэпазіторый БрДУ імя А.С.Пушкіна

здолеў перамагчы такую небяспечную хваробу як рак, і больш за тое, – заснаваў фундацыю «Lance Armstrong Foundation» у мэтах падтрымкі людзей, якія змагаюцца з ракам, лічба членаў якой перавысіла 20 млн. У адказ на пытанне аб праблеме прымянення забароненых сродкаў у спорце, ён выказаўся наступным чынам: допінг у веласпорце існаваў заўсёды, толькі мяняліся ягоныя формы і ягонае пакаленне не адрозніваецца ад іншых, проста «дапамога» падобнага тыпу эвалюцыянавала на працягу шэрагу гадоў [4]. Амерыканскі велагоншчык прызнаўся, што прымаў эрытрапаэтын (EPO) перад кожным з сямі пераможных стартаў у спаборніцтвах Tour de France. [1].

Як відаць дыялектычныя супрацьлегласці маюць месца ў сучасным спорце, а найбольш яскравым іх адлюстраваннем з'яўляюцца прынцыпы Fair play і Foul play.

За прынцыпамі Fair play несумненна знаходзіцца багатая этычная традыцыя. Адначасова супраць іх ў практыцы спартыўнай дзейнасці назбірана мноства аргументаў, як з повадu практычнай рацыянальнасці, так і суб'ектыўных і групавых эмоцыяў. Барацьба гэтых дзвюх тэндэнцыяў у рэальным жыцці пераносіцца на галіну спорта. Уласна таму і паўстае Foul play, што вяртаецца праз пэўны час праз іншыя дзверы і чакае чарговага адхілення праз Fair play. Ці ж не ствараюць абодва паняцці дыялектычную пару ўзаемазалежных ад сябе раўнапраўных тэндэнцыяў, што адлюстроўваюць барацьбу дабра са злом, свету з цемрай, неба і пекла, альтруізму і эгаізму і г.д. [5, 172-173].

Праблема ўжывання допінгу ў спорце, якую можна разглядаць з розных пунктаў бачання, ілюстратыўна вельмі выразна дапасоўваецца да суадносінаў Fair play vs. Foul play. Па сутнасці, пытанне датычыцца эфектыўнасці допінгу, іншымі словамі, ягонага рэальнага ўплыву на павелічэнне здольнасці арганізму спартоўцаў, а таксама ягоны патэнцыяльна шкодны ўплыў на здароўе і жыццё атлетаў. Адсюль робіцца выснова: ці ўжыванне допінгу павінна быць забароненае згодна з правам і падмацавана адпаведнымі прававымі санкцыямі? Аргументы супраць прымянення забароненых стымулятараў у спорце можна звесці да двух самых галоўных: па-першае, допінг несумяшчальны з прынцыпамі, якія з'яўляюцца абавязковымі ў спартыўным спаборніцтве, і ў такім выпадку губляецца сэнс у занятках спортам; па-другое, ужыванне допінгу пагражае здароўю і жыццю атлетаў, а тым самым ставіць пад сумненне выснову, што заняткі спортам павінны спрыяць фізічнаму развіццю асобы. [7, 66-67]. Такі падыход у цяперашні час натыкаецца на розныя іншыя кантраверсіі і выглядае дыскусійна, напрыклад, з пункту гледжання таго самага права. Калі спартовец на сваім уласным целе вырабляе разнастайныя тату, то гэта не перашкаджае яму ўдзельнічаць у трэніроўках і спаборніцтвах. Права адназначна трактуе цела кожнай чалавечай асобы як ягоную неаспрэчную ўласнасць, куды аўтаматычна залічваецца індывідуальнае здароўе. У такім разе допінг, – як бы ён не ўздзейнічаў на чалавечае здароўе, – становіцца прадметам абмеркавання толькі ў тым сэнсе, на колькі распаўсюджваецца права валодання чалавекам сваім асабістым целам. Ці ўвогуле можна ў дадзеным кантэксце акрэсліваць нейкія межы? Іншая справа, калі размова ідзе пра ідэю раўнапраўнага і сумленнага спаборніцтва па загадзя акрэсленых правілах. Але так ці інакш сучасны спорт набліжаецца да грандыёзнага падзелу менавіта па допінгаваму крытэрыю. Дзве найбольш вялікія групы атлетаў у рэшце рэштаў вызначацца такім чынам, што будуць рэпрэзентаваць Open competitions і Fair play competitions. Да першай будуць адносіцца спартоўцы, якія ўжываюць допінг, да другой тыя, хто яго прынцыпова пазбягае. Для гэтай рэвалюцыі маюцца ўсе падставы. Нездарма цытаваны вышэй Ланс Армстранг адкрыта гаворыць пра тое, што допінг у веласпорце існаваў заўсёды.

Рэпазіторый БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ВЫСНОВЫ

Спорт на сучасным этапе свайго развіцця стварае вялізарныя магчымасці для самарэалізацыі чалавечай асобы ў шмат якіх сферах сацыяльнай дзейнасці. Імідж спорту можа ствараць атракцыйнае і пазітыўнае ўражанне, але адначасова ён паўстае ў сваім брутальным і агідным абліччы. Спорт па сваёй сутнасці прыцягвае да сябе дзяцей і моладзь разнастайнымі формамі, якія разлічаныя літаральна на кожную асобу незалежна ад узроўню яе здольнасцяў, уменняў і падрыхтаванасці. Неабходна таксама падкрэсліць вялізарную ролю школы ў заахвочванні дзяцей і моладзі да ўдзелу ў рухавай актыўнасці на працягу ўсяго жыцця. Як паказвае практыка, нізкі ўдзел людзей у рухавай актыўнасці па большасці звязаны з праблемай адпаведных узораў, якія пакаленне дарослых перадае сваім дзецям. Малаактыўныя ў спорце бацькі выхоўваюць сваіх дзяцей у падобных адносінах да здаровага ладу жыцця. [6, 25-26]. Такія стасункі да спорту могуць тлумачыцца цэлым шэрагам прычынаў, адной з якіх з'яўляецца адсутнасць замацаваных сямейных традыцыяў у гэтай галіне. Дагэтуль у шырокіх грамадскіх колах спорт працягвае заставацца на мяжы «уключанасці» ў культуру як яе элемент.

Такім чынам, неабходна пазначыць, што спорт працягвае займаць значнае месца ў культуры фармавання вольнага часу дзяцей і моладзі і моцна ўплывае на станаўленне іх схільнасцяў і стэрэатыпаў паводзінаў. Маладое пакаленне «паглынае» з аднолькавай актыўнасцю як станоўчыя, так адмоўныя аспекты спартыўнай дзейнасці. Праблема маральнага выбару становіцца дамінантай у інтэрпрэтацыі суадносінаў «дабра» і «зла» ці Fair play і Foul play. Наяўнасць і перавага маральна пазітыўнага складальніка дае магчымасць спорту захавацца ў якасці феномену сумленнай і высакароднай барацьбы на спаборніцтвах, а таксама застацца той галіной, якая спрычыняецца да фармавання гарманічна развітой асобы.

Маральная інтэрпрэтацыя спартыўнай дзейнасці сучаснага глабалізаванага грамадства стварае ўсе падставы для замацавання адпаведных стэрэатыпаў паводзінаў у дзяцей і моладзі. Спорт фармуе ў іх спецыфічную культуру, якая становіцца дамінантай у розных іншых сферах грамадскай актыўнасці. Найбольш небяспечныя праявы гэтага працэсу выяўляюцца ў разнастайных сацыяльных дэвіяцыях, хоць найважнейшай мэтай спорту па-ранейшаму застаецца арыентацыя на захаванне сумленнага і высакароднага спаборніцтва.

Moral interpretation of sports activity of the modern globalized society contains all preconditions for fastening of corresponding stereotypes of behaviour at children and youth. Sports form at them specific culture which becomes a dominant in other different spheres of public activity. The most dangerous phenomena of this process are shown in various social deviations though the most important purpose of sports on former there is an orientation to preservation of fair and noble competition

1.Armstrong: Bez dopingu jechałem tylko raz [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://sport.newsweek.pl/armstrong--bez-dopingu-jechalem-tylko-raz,100545,1,1.html. – Дата доступу: 31.01.2013.

2.Czechowski, M., Dąbrowska, A. Fair play w sporcie i życiu młodzieży. Warsztaty dydaktyczne dla nauczycieli i młodzieży szkolnej. Zeszyt nr 1. – Warszawa: Estrella Sp. z o.o., 2011. – 80 s.

3.Ibrahimović, Z., Lagercrantz, D. Ja, Ibra. – Kraków: Wydawnictwo «Sine Qua Non», 2012. – 389 s.

4.Lance Armstrong: czuję się kozłem ofiarnym [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://urosport.onet.pl/kolarstwo/lance-armstrong-czuje-sie-kozlem-ofiarnym,1,5408518,wiadomosc.html. – Дата доступу: 31.01.2013.

5.Lipiec, J. Filozofia Olimpizmu. – Warszawa: Polskie wydawnictwo sportowe SPRINT, 1999. – 234 s.

Репозиторий БрГУ имени А.С.Пушкина

6. Piech, K. Olimpiady przedszkolaków. Z warsztatami dydaktycznymi dla nauczycieli przedszkoli, rodziców i dzieci. Zeszyt nr 3. – Warszawa: Estrella Sp. z o.o., 2012. – 68 s.

7. Przyluska-Fiszer, A., Misiuna, B. Etyczne aspekty sportu. – Warszawa: Wydawnictwo AWF, 1993. – 155 s.

УДК 394/395

**АКИНЧИЦ И.И.**

Беларусь, Брест, УО «Брестский государственный технический университет»

## КАНОНЫ НАРОДНОЙ ИГРЫ

В суверенной Беларуси заметно возрос интерес к народной культуре, к жизни наших предков. Одной из форм проявления этой культуры является народная игра, в которой ярко отражены образ жизни, быт коренного населения, его национальные устои, вековые представления о чести, мужестве, достоинстве и т.д. Обращаясь к народной игре, мы устанавливаем связь между культурой прошлых и ныне живущих поколений, творчески усваиваем древние мудрые истины, формируем личность, ибо такая игра развивает лучшие качества человека. Благодаря народной игре индивид ощущает себя органическим элементом своего этноса, поскольку вовлекается в жизнь социума в психологическом и эстетическом аспектах. «В игре, – отмечал А.Ф.Лосев, – есть все достоинства искусства: и идеал, и мудрость, и высокое, и трагическое, и комическое – все, чем богата жизнь» [2, 530].

Понятие «игра» встречается в различных словосочетаниях: детская игра, политическая игра, игра актера или музыканта, игра воображения и т.д. Именно поэтому великий английский писатель В.Шекспир утверждал, что весь мир – это театр, а люди в нем – актеры. Но в философии под игрой понимается широкий круг деятельности животных и человека, противопоставленный утилитарно-практической деятельности и характеризующийся переживанием удовольствия от самой деятельности. Следовательно, игра представляет собой развлечение, не направленное на обязательное достижение результата, необходимого для дальнейшей практической деятельности. Мотив игры заключается не в результате, а в самом процессе, ибо она есть одновременно и цель, и действие, и наслаждение. «Положение, определяющее сущность игры, – писал С.Л.Рубинштейн, – состоит в том, что мотивы игры заключаются в многообразных переживаниях, значимых для играющего, различных сторон действительности» [4, 98].

По мнению швейцарского психолога Ж.Пиаже первоначально преобладает сенсомоторная игра, т.е. повторяемые или же варьируемые движения и действия с предметами. Затем она замещается символической игрой, т.е. оперированием индивидуальными знаками вещей, людей, событий. Наконец, на смену ей приходит игра по канонам, когда организующим началом становится правило, обязательное для всех ее участников. Согласно концепции этого ученого, такой переход отражает направление когнитивного развития личности [см.: 3, 79]. Затем известный советский психолог Д.Б.Эльконин выделил следующие этапы игры: предметная игра (игра детей в возрасте до 3-х лет), ролевая игра (в возрасте от 3-х до 7 лет), игра с правилами (после 7 лет) [см.: 5; 6]. При этом детские игры он рассматривал как форму включения ребенка в мир действий и отношений. Он справедливо отмечал, что сущность детской игры заключается в стремлении ребенка «быть как взрослый». А развитие

Репозиторий БрГУ им. А.С.Пушкина